# Сучасна-харэаграфічна

**Апошнім восеньскім вечарам завяршыўся XXXVI IFMC — Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі ў Віцебску. Ён сабраў прадстаўнікоў Германіі, Італіі, Казахстана, Расіі, Францыі і, вядома, Беларусі. Першую прэмію на рэспубліканскім конкурсе атрымаў мясцовы тэатр-студыя. Іншыя ўзнагароды паехалі ў Гомель і Мінск. А некалькі замежных гасцявых калектываў па традыцыі выступілі яшчэ ў сталіцы.**



## КОНКУРС

— Сёлетні рэспубліканскі конкурс, — гаворыць старшыня Міжнароднага журы, народны артыст Беларусі Канстанцін Кузняцоў, — быў апошнім. З наступнага года такія творчыя спаборніцтвы будуць выключна міжнароднымі. Гэта сведчыць, што ўзровень нашых калектываў значна ўзрос. Нагадаю, фестываль пачынаўся з міжнародных конкурсаў, потым пачаў чаргаваць іх з рэспубліканскімі — дзеля падтрымкі беларускіх удзельнікаў. І цяпер зноў вяртаецца да пачатковага варыянту, бо відавочна, што сваю місію па выхаванні маладых айчынных артыстаў і пастаноўшчыкаў сучаснай харэаграфіі ён выканаў. Сёння такая дысцыпліна выкладаецца ва ўсіх профільных навучальных установах. Таму конкурс сабраў ажно 20 нашых калектываў, а сярод яго ўдзельнікаў былі і артысты Музычнага, Маладзёжнага тэатраў са сваімі праектамі, і прыватныя студыі. Тыя, хто калісьці прыязджалі на фестываль, паспелі ўзрасціць тры-чатыры пакаленні вучняў. А тое, што раней здавалася недасягальным па выкананні, сёння ўспрымаецца звыклай базавай асновай. Прыемна, што вызначыліся яркія стылі некаторых пастаноўшчыкаў: чытаеш прозвішча — і ўжо ўяўляеш, чаго чакаць. А той жа БДУКМ уражвае разнастылёвасцю, бо выстаўляе працы ўсё новых студэнтаў. Зразумела, хтосьці прыязджае ледзь не штогод. Але конкурс застаецца жывым, на ім ацэньваюцца не былыя заслугі, а тое, чым здзіўляюць сёння і цяпер. Да прыкладу, ансамбль “Алеся” з Магілёва мінулым разам атрымаў першую прэмію, а сёлета нават не выйшаў у фінал. І не таму, што знізіў планку, а таму, што знайшліся больш цікавыя пастаноўкі! Цяперашняя перамога Тэатра-студыі сучаснай харэаграфіі Цэнтра культуры “Віцебск” цалкам заслужаная. Харэограф Дзіна Юрчанка, вядомая сваім тэатральным мысленнем і ўдалымі працамі ў драмтэатрах, пераўзышла саму сябе. Кампазіцыя “Жылі... Былі...” заснавана на фальклоры, у ёй узняты пласт беларускай міфалогіі. Артысты танчаць, спяваюць, іграюць на музычных інструментах, вядуць дыялогі, ствараючы гэткі саўндтрэк. За восем хвілін перад намі паўстае паўнавартасны спектакль! А пяць фестывальных дзён утрымліваюць столькі прафесійнай інфармацыі, колькі ўдзельнікі не назбіраюць і за год. Каб больш змясціць, некаторыя мерапрыемствы праходзілі паралельна ў розных залах. Адзначу сапраўднае падзвіжніцтва аўтара ідэі і нязменнага дырэктара фестывалю Марыны Раманоўскай, выдатную арганізацыю, добра наладжаную працу шматлікіх валанцёраў. І пры ўсёй конкурснай канкурэнцыі — надзіва сяброўскую, добразычлівую атмасферу.



## ГАСЦЯВАЯ ПРАГРАМА

Паказальнікам высокага ўзроўню развіцця айчыннай сучаснай харэаграфіі стала запрашэнне не толькі замежных, але і беларускіх яе прадстаўнікоў для правядзення майстар-класаў і дэманстрацыі спектакляў. Неверагодны ажыятаж выклікала “Крохкасць” Беларускага дзяржаўнага маладзёжнага тэатра. Гэтую пастаноўку ажыццявіла Аляксандра Буяльская ў разліку на малую сцэну. Квіткі разлятаюцца імгненна, і публіка, асабліва моладзь, гатова глядзець балет па некалькі разоў. Таму пасля аншлагавага паказу ў Віцебскай абласной філармоніі спектакль перанеслі на вялікую.

Удала прайшла і другая пастаноўка таго ж тэатра — “Шынель. Гогаль” у версіі Кірыла Балтрукова. У монаспектаклі “One man boll” адкрыццём стала імя Уладзіслава Касцючэнкі. Родам з Гомеля, ён стаў чэмпіёнам свету па футбольным фрыстайле, удзельнічаў у цыркавым фестывалі ў Парыжы. Таму спалучыў танец са спортам і акцёрскім майстэрствам, прафесійна натрэніраванае цела — з мячом. Харэограф і педагог Дзмітрый Залескі, які калісьці ўдзельнічаў і ў конкурсе і ў гасцявых паказах, правёў майстар-клас. На такіх занятках шчодра дзяліліся вопытам таксама замежнікі.

Балетная трупа “Новай оперы” з Масквы паказала дывертысмент, складзены з трох рознастылёвых мініяцюр расійскіх харэографаў. Там пасвойму інтэрпрэтаваліся танцавальная вечарынка 1950-х, “Ундзіна” і асабліва “Балеро” М. Равэля. Як заўжды, прыязджаў “Балет Яўгена Панфілава” з Пярмі — з ранейшымі пастаноўкамі і з прэм’ерай аднаактоўкі “Лялька” пра штучны інтэлект. Былі вечарына памяці гэтага харэографа, якому сёлета магло б споўніцца 70 гадоў, лекцыі пра яго творчасць і сучасны танец увогуле.

Маладзёжны тэатр у Мінску, тэрмінова замяніўшы свой “Казіны востраў” на Вечар сучаснай харэаграфіі, прымаў гасцей з Рыма і Берліна з трыма аднаактовымі балетамі, дагэтуль паказанымі ў Віцебску. Чэлябінскі ж тэатр сучаснага танца туды прывёз “Дыялогі”, а ў сталіцу — “Бягучыя”. Харэограф абодвух спектакляў — Вольга Пона, чыя творчая кар’ера пачыналася з IFMC. “Невядомая жанчына” ў выкананні італьянкі Марыі Косу скарыла гнуткасцю рук, быццам пазбаўленых костак. “Лепшае месца” той жа кампаніі Spellbound Contemporary Ballet прыцягнула адметнай пластыкай целаў, выразнасцю ступняў, якімі было сказана больш, чым можна было б распавесці словамі. А “Звычайныя людзі”, заснаваныя на партэрнай тэхніцы, праз выразныя постаці і лакальнае асвятленне выклікалі безліч скульптурных асацыяцый. І філасофскі роздум пра магчымасць замяніць канфлікт прыходам да гармоніі.

Дачакаемся новага форуму!

**Надзея БУНЦЭВІЧ**
Фота з архіваў фестывалю

